Русаў П.А.

# Папярэднія вынікі археалагічнага нагляду на тэрыторыі сярэдневяковай дваравой кухні Замкавага комплексу “Мір” у 2007 годзе

На працягу 24 гадоў поруч ідуць рэстаўрацыйныя работы і археалагічныя даследаванні гісторыка-культурнай каштоўнасці Замкавы комплекс “Мір” у г.п. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Першыя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі помніка правёў у 1912 г. Ю. Ядкоўскі. За чарадой гадоў небыцця пачалі нарэшце вывучаць з 60-х гадоў XX ст. беларускія навукоўцы архітэктуру Мірскага замка і культурны пласт прылягаючай да яго тэрыторыі і самаго мястэчка [1]. Абагульняючая і падрабязная інфармацыя археалагічнага і архітэктурнага даследаванняў гэтых гадоў надрукавана ў манаграфіі “Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка” [2]. Ізноў больш чым на дзесяцігоддзе археалагічныя даследаванні на помніку спыніліся. І толькі ў сувязі з пачаткам маштабных земляных работ па будаўніцтву рэстарана ва ўсходняй частцы абарончага вала ў 2003 г. там быў закладзены раскоп з парадкавым нумарам 51 агульнай плошчай 840 м$^2$ [3].

У маі 2007 г. РБРУП “Мінскрэстаўрацыя” распачала земляныя работы на тэрыторыі сярэдневяковай дваравой кухні без археалагічнага нагляду і папярэдняга паведамлення Дырэкцыі НММ РБ і НАН Беларусі. Такія дзеянні маглі б прывесці да знішчэння культурнага пласта і артэфактаў. У адпаведнасці з “Нарматыўным дакументам па правядзенню археалагічных даследаванняў” (зацверджаным пастановай Бюро Прэзідыума НАН Беларусі 12.05.2006 № 246) пункта 7 “Мерапрыемствы па захаванні археалагічных помнікаў” кіраўніцтва НММ РБ узгадніла правядзенне археалагічнага нагляду на аб’екце.

Інстытут гісторыі НАН Беларусі выдаў супрацоўніку музея Русаву П.А “Дазвол” № 1842 па форме № 4, зарэгістраваны 18.07.2007 г. Упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры РБ, які прыбыў на месца правядзення работ 19.07.2007 г.

У адпаведнасці з патрабаваннямі ўзгаданага “Нарматыўнага дакумента па правядзенню археалагічных даследаванняў” прадугледжваецца даследуемую тэрыторыю археалагічнага помніка нумараваць. Яе чарговы парадкавы нумар 52.

Муры сярэдневяковай дваравой кухні былі адкрыты падчас археалагічных раскопак 1982–1983 гг. Сцены і культурныя адкладанні яе ўнутранай тэрыторыі археолагі наўмысна не кранулі каб “закансерваваць” для будучыні, для магчымага вывучэння іх новай і дасканалай тэхнікай. Таму перад пачаткам рэстаўрацыйных работ у 2007 г. захаваўся культурны пласт

паміж сценамі руін, які ўзвышаўся на 0,2–0,4 м над акаляючай плошчай двара. Да гэтых маляўнічых рэшткаў з боку двара падымаліся прыступкі з бетоннай рошчыны.

Да прыезду археолага рэстаўратарамі на палове тэрыторыі кухні плошчай 90 м$^2$ быў выбраны культурны пласт да неабходнай ім праектнай глыбіні 50–60 см ад узроўню паверхні некранутай папярэднімі даследаваннямі. У раскапаныя межы трапілі не разбураныя яшчэ цагляныя сцены, брук і цэгла падлогі. Пад наглядам археолага былі раскрыты ўсе руіны сцен. У выніку была ўдакладнена гісторыя будаўніцтва сцен, якія мы ў працяг меркаванняў папярэдніх даследчыкаў будзем называць “дваравая кухня”, выкарыстоўваючы адначасова для яе яшчэ і тэрмін будынак.

“Дваравая кухня” плошчай 176,5 м$^2$ акантурана трыма сваімі сценамі – паўночнай, заходняй і ўсходняй, а таксама паўднёвай сцяной замка. Паўночная сцяна гэтых руін даўжынёй 26 м. Да паўночнай сцяны будынка і паўднёвай сцяны замка прымыкаюць заходняя і ўсходняя сцены кухні, кожная даўжынёй адпаведна па 7,18 м і 6,4 м. Адрозненні ў даўжыні гэтых сцен тлумачацца наступным.

Паўднёвая сцяна замка не перпендыкулярная яе заходняй сцяне, таксама на трэці сваёй даўжыні ад паўднёва-заходняй вежы непрыкметна паварочвае ўнутр тэрыторыі двара. З вонкавага боку замка гэты паварот не прасочваецца з-за выступаючых муроў паўднёва-заходняй і паўднёва-ўсходняй веж. Заходняя сцяна “дваравой кухні” паралельная заходняй сцяне замка. Заходняя і паўночная сцены будынка не перпендыкулярныя адна другой і ўтвараюць тупы вугал знутры памяшкання. Паўночная сцяна кухні прамалінейная, але і не паралельная паўднёвай сцяне замка: паўднёвая замкавая сцяна, пачынаючы ад заходняй вежы, пралягае ў разыходзячым накірунку адносна паўночнай сцяны “дваравой кухні”, а за выгібам пралягае ў зыходзячым да яе накірунку. Такім чынам, план раскапанага будынка нагадвае прамакутнік з дзвюма не аднолькавымі па даўжыні кароткімі сценамі, усходняй і заходняй, доўгай паўночнай сцяной, а таксама выгінутай паўднёвай сцяной замка.

Плошча “дваравой кухні” падзелена трыма ўнутранымі прасценкамі на чатыры паслядоўна размешчаныя пакоі. Кожнаму пакою і прасценку быў прысвоены парадкавы нумар. Пакой №1 знаходзіцца на заходнім баку. Пакой №2 прымыкае да №1, пакой №3 – да №2. Да пакоя №3 прымыкае пакой №4, які знаходзіцца з усходняга боку “дваравой кухні” (мал. 1–4).

Унутраная плошча пакоя №1 звыш 44 м$^2$ у форме няправільнага квадрата (7 х 6,1 х 7,3 х 6,18 м). Унутраная плошча пакоя №2 звыш 40 м$^2$ (6,5 х 6,22 м), №3 да 13 м$^2$ (2,12 х 6,12 м) і №4 да 35 м$^2$ (5,82 х 6 м). Прасценак №1 – шырынёй 0,9 м. Ён аддзяляе пакоі №№1 і 2. Прасценак №2 шырынёй 0,9 м аддзяляе пакоі №№2 і 3. Прасценак №4 шырынёй 0,8 м аддзяляе пакоі №№3 і 4.

Вышыня адкапаных сцен неаднолькавая. У заходняй і ўсходняй частках будынка сцены ўзвышаюцца на 1–1,2 м ад дзённай паверхні, у цэнтральнай 0,3–0,6 м.

Сцены пакоя №1 адрозніваюцца сістэмай кладкі, але ўся рошчына з вапны.

1. Заходняя сцяна ўзведзена з цэглы-пальчаткі (29 х 12,5–13 х 7,5–6–7 см). Вонкавая паверхня гэтай сцяны з кладкай цэглы ў тры радкі лажок і тры радкі тычок. Яе ўнутраная паверхня выкладзена з двух радкоў тычка і двух радкоў лажка. У сцяне знаходзяцца рэшткі дзвярнога праёма шырынёй 1,3 см з уступам у палову цэглы з вонкавага боку для дзвярной каробкі. Дзверы адчыняліся вонкі. Сцяна знутры – ніжэй узроўню падлогі дзвярнога праёма, з адступам на палову цэглы для лаг. Цагляная сцяна ўзведзена на падмурку з аднаго радка камянёў (0,5–0,6 х 0,3–0,4 м) (мал. 5, 6).

2. Усходняя сцяна пакоя № 1 (прасценак № 1) выкладзена з цэглы-пальчаткі (28 х 14 х 10 см), таксама мураванай на вапнавай рошчыне. Частка сцяны, што прымыкала да сцяны замка, выкладзена з вонкавага боку камянямі дыяметрам да 0,6–0,7 м, размешчанымі на адлегласці 0,8–0,9 м паміж сабой з забутоўкай камянямі (0,2–0,3 м) і цэглай. Вонкавая паверхня камянёў чэсаная. З унутранага боку сцяны цэгла выкладзена тычкамі. У ніжніх радках з вонкавага боку налічвае тры цэментныя блокі (40 х 12 х ?, 31,5 х 12 х ? і 28 х 22,5 х 20 см).

3. Па фрагментах аднаго-двух цагляных радкоў паўночнай сцяны пакоя № 1 можна меркаваць пра адпаведнасць кладцы заходняй сцяны.

У пакоі № 2 паўночная сцяна захавалася на вышыню двух-трох радкоў з цэглы-пальчаткі, пакладзенай на каменны падмурак. Кладка сцяны не перавязана з прасценкам № 1 пакоя № 1 і прасценкам № 2 пакоя № 3. Паверхня кладкі выраўноўвалася пляскатай дахоўкай, якая датуецца першай паловай XVI ст.

У пакоі № 3 паўночная сцяна захавалася толькі адным падмуркам з каменю. Заходняя сцяна пакоя (прасценак № 2) выкладзена з цэглы-пальчаткі (25 х 12,5 х 5,5 і 25 х 13,5 х 5,5 см).

У межах пакоя № 4 кладка сцен розная. У заходняй сцяне (прасценак № 3) цэгла-пальчатка (26,5 х 13 х 6 і 27 х 13 х 6 см). З вонкавага боку яна выкладзена тычкамі. З унутранага боку – два радкі лажка і два-тры радкі тычка. Паўночная сцяна выкладзена цэглай-пальчаткай (25 х 12 х 6,5 і 28 х 12,5 х 6 см). З вонкавага боку – кладкай у адзін радок тычка і другім радком тычка з лажком, або радком з двума тычкамі і лажком. Таксама выкарыстоўваўся камень (20–25 х 20–22 см). Камень клаўся праз два радкі цэглы. Паміж кожным каменем у радку – адлегласць 120–130 см. З унутранага боку кожны радок выкладзены ў тычок і лажок. Усходняя сцяна пакоя № 4 захавалася на два-тры радкі з тэхнікай кладкі, падобнай да заходняй сцяны пакоя № 1. Памеры цэглы-пальчаткі 26,5–27 х 12,5–13 х 6–

6,5 см. Дзвярны праём іншай канструкцыі выяўлены і ў заходняй сцяне пакоя № 4 (прасценак № 3). Праём пашыраецца ад 1,1 м з боку пакоя № 3 да 1,4 м у бок пакоя № 4. Выемка для дзвярной каробкі ў палову цэглы знаходзілася ў вузкай частцы праёма. Дзверы адчыняліся ўнутр пакоя № 3 (мал. 7, 8).

Даследаваць глыбіню залягання усіх падмуркаў будынка не дазвалялі ўмовы, пры якіх праходзіў археалагічны нагляд: адсутнасць фінансавання на земляныя работы па правядзенню археалагічных раскопак і паспешлівасць “рэстаўрацыйных” работ. Выпадкова атрымалася закласці толькі адзін шурф побач з заходняй сцяной знутры пакоя № 1. Выявілася, што падмурак пачынаўся ад мацерыковай паверхні. Выкіды грунту пад траншэю падмурка перакрывалі культурныя адкладанні XV–XVI стст. таўшчынёй да 0,2 м. На гэты падмурак на глыбіні 0,1–0,2 м ад сучаснай дзённай паверхні пакладзены другі з аднаго радка камянёў значна большых памераў, аб чым узгадана вышэй. Шырыня другога падмурка перавышала шырыню ніжэйляжачага на 0,1–0,15 м. На другім падмурку і была ўзведзена цагляная сцяна.

Вакол “дваравой кухні” быў выбраны брук пад бетонную апалубку. Пад ім выяўлены працяг падмурка паўночнай яго сцяны ў бок заходняй і ўсходняй сцен замка. Яго шырыня вагаецца ў межах 0,8–0,9 м і выкладзены ён з камянёў памерамі 0,2–0,4 м, замацаваных вапнавай рошчынай. Дадзены падмурак адносіцца да сярэдневяковай дваравой кухні.

У паўднёвай сцяне замка, у межах пакояў №№ 1 і 2, выяўлены тры арачныя глухія нішы і кожнай прысвоена нумарацыя. Нішы №№ 1 і 2 знаходзіліся ў межах пакоя № 1, ніша № 3 у межах пакоя № 2. Глыбіня ніш 1,1 м, шырыня 1,44–1,45 м. Замераная намі таўшчыня паўднёвай сцяны замка – 2,35 м. Добра захвалася верхняя частка скляпення нішы № 2, па якой аднаўляецца вонкавы від кладкі аркі. Скляпенне аркі выступае 0,3 м паліцай з двух радкоў цэглы (29 х 12,5 х 8 см), пакладзенай на рабро. Скляпенне паліцы пераходзіць у вертыкальныя слупкі, якія таксама выступаюць на чвэрць цэглы ад паверхні замкавай сцяны. Верх скляпенняў гэтых ніш ніжэйшы за верх скляпенняў ніш у заходняй сцяне замка на 0,7–0,8 м (мал. 9–12).

Безумоўна, нішы выконвалі асаблівую ролю. Замак узведзены на правым беразе безыменнага ручая, правага прытока рэчкі Міранка. Грунтовыя воды, якія заўсёды спадарожнічаюць рэчышчам, маглі інфільтравацца праз цагляную масу паўднёвай сцяны і паступова падымацца да верхніх пакояў. Сярэдневяковы зодчы спраектаваў у сцяне нішы для асноўнай мэты. Тонкая сценка нішаў выветрываецца хутчэй за тоўстую, і паступова накірунак інфільтрацыі накіроўваецца ў іх бок, адцягваючы вільгаць ад астатняй тоўстай часткі сцен. Некаторы час пасля ўзвядзення замка нішы яшчэ былі адкрытыя і, верагодна, толькі з будаўніцтвам сярэдневяковай дваравой кухні засыпаны грунтам. На гэта ўказваюць наступныя факты.

Падчас узвядзення заходняй вонкавай сцяны пакоя № 1 праём нішы № 1 не быў закладзены ранейшым падмуркам і да яе быў вольны доступ. У выніку ўдалося даследаваць культурныя адкладанні, у якіх выяўлены рэчы XIX–XX стст. і некалькі фрагментаў цэглы-пальчаткі (29 х 15 х 9,5 см).

Ніша № 2 закрывалася на тры чвэрці шырыні ранейшым падмуркам, што быў пад прасценкам № 1. Пры фатаграфаванні ўнутранай прасторы нішы з дапамогаю ўспышкі высветлілася, што на паверхні культурнага пласта знаходзіцца гаршчок. Ён быццам наўмысна быў пастаўлены на паверхню грунту ў нішы. Па форме вянца і наяўнасці пясчанай падсыпкі донца гаршчок датуецца XVI ст. З-за абмежаванасці праёма нішы, закрытай прасценкам № 1, толькі часткова даследаваны культурныя адкладанні, але і гэта дало плённыя вынікі: быў выяўлены фрагмент гаршковай кафлі XV ст. з круглым вусцем (мал. 13).

Відавочна, што гаршчок не разбілі і наўмысна паставілі ў нішу. Звычаёвым было выкарыстанне гаршкоў у рытуальных і абрадавых мэтах. Нярэдка іх муравалі ў асновах печаў. Магчыма, мы атрымалі сведчанне нейкіх рытуальных падзей, якія адбыліся падчас закладкі сярэдневяковай кухні.

Да прыезду археолага будаўнікамі быў выкапаны культурны пласт у пакоях №№ 1 і 2 да глыбіні 0,6 м ад дзённай паверхні, але некранутымі засталіся фрагменты падлогі з цэглы і брука. Таму нагляд за ходам земляных работ ажыццяўляўся ў пакоях №№ 3 і 4.

У пакоі № 2 пры падрыхтоўцы падлогі для фатаграфавання пад адной з цаглін знойдзены солід 1600 г., Рыга, Сігізмунд III Ваза (1587–1632) (мал. 14).

У пакоі № 3 падлога не выяўлена. Культурныя адкладанні чорнага колеру, ледзь вільготныя і ўтрымлівалі фрагменты прадметаў XX ст. Побач сцяны за́мка адкрыліся рэшткі каміна, ад якога застаўся невялікі фрагмент кладкі (25 х 60 см) з цэглы-пальчаткі (29–28 х 12 х 6,8 см) на вапнавай рошчыне. У яе развале знойдзены фрагмент карычневапаліванай кафлі з раслінным арнаментам канца XIX – пачатку XX ст.

У пакоі № 4 падлога не выяўлена. Даследаваны культурныя адкладанні 0,6 м. Пласт светлага колеру насычаны будаўнічым друзам з кавалкамі вапнавай рошчыны, дробным каменем, фрагментамі плітак падлогі XVIII–XIX стст. і пляскатай дахоўкі XVII ст., бітай гатычнай і рэнесансавай цэглай-пальчаткай. У заходнім куце памяшкання адкрыліся рэшткі падмурка печы памерам 1,1 х 2,1 м, выкладзенай з цэглы-пальчаткі 28 х 12–13 х 6 – 6,5 см. Печ прымыкала вузкім бокам да прасценка № 3 (мал. 15, 16). З чорнымі слядамі абпалення паверхня цэглы чарэні печы, а таксама паверхня цэглы ў прасценку на ўзроўні чарэні.

З усяго вышэйпрыведзенага выдзелім галоўныя палажэнні, згрупаваныя ў два асноўныя аспекты, што дае магчымасць прыйсці да некаторых папярэдніх высноў.

**I. Архітэктурны:**

1. Тэхніка кладкі сцен пакоя № 1 адрозніваецца ад тэхнікі кладкі пакояў №№ 3 і 4.
2. Частка сцяны паміж пакоямі № 1 і № 2, што прымыкала да сцяны замка, абліцавана чэсаным каменем, у другой яе частцы пакладзены цэментныя блокі.
3. У пакоі № 3 знаходзіўся камін, у пакоі № 4 – печ. Вусце печы выходзіла ў пакой № 3.
4. Паўночная сцяна адрозніваецца сістэмай кладкі ў межах пакояў №№ 1, 2 і 4. Яе кладка ў пакоі № 2 не перавязана са сценамі пакояў №№ 1 і 3. Для выраўноўвання паверхні кладкі пакоя № 2 выкарыстоўвалася пляскатая дахоўка першай паловы XVI ст.
5. Падмурак пад паўночнай сцяной "дваравой кухні" выкладзены з камянёў на вапнавай рошчыне і цягнецца па-за яго межамі да муроў замка. Ён адносіцца да часу правядзення будаўнічых работ у канцы XVI – пачатку XVII ст.
6. Падмуркі і сцены пакояў №№ 1, 3 і 4 узведзены на падмурку сярэдневяковай дваравой кухні.

**II. Археалагічны:**

1. Склад рэчаў культурных адкладанняў нішы № 1, пакоя № 1 датуецца XIX–XX стст.
2. У культурных адкладаннях нішы № 2 пакоя № 1 знойдзены цэлы гаршчок XVI ст. і фрагмент гаршковай кафлі XV ст.
3. Пад цаглянай падлогай у культурных адкладах пакоя № 2 выяўлены солід 1600 г.
4. Верхнія культурныя адкладанні таўшчынёй 0,6 м пакоя № 3 з прадметамі XIX–XX стст.
5. Камін пакоя № 3 быў аздоблены карычневапаліванай кафляй, датуемай канцом XIX – пачаткам XX ст.
6. У пакоі № 4 верхні слой (0,6 м) культурнага пласта насычаны вапнай, дробнымі камянямі і будаўнічым матэрыялам XVII–XIX стст.

Такім чынам, падчас археалагічнага нагляду 2007 г. выявілася, што ў двары замка побач з паўднёвай абарончай сцяной неаднаразова ўзводзіліся сцены пабудоў. На гэта ўказваюць сістэма кладкі, склад будаўнічага матэрыялу і выяўленыя рэчы. Рэшткі муроў, названыя папярэднімі даследчыкамі як "сярэдневяковая дваравая кухня", прадстаўляюць сабой асобныя і розначасовыя будынкі.

Сярэдневяковая дваравая кухня магла налічваць некалькі пакояў, якія размяшчаліся ўздоўж паўднёвай сцяны замка. Час яе будаўніцтва мы адносім у межы канца XVI – пачатку XVII ст., што засведчваецца солідам 1600 г., гаршком XVI ст., закладзеным у нішы № 2, і рэшткамі гаршковай кафлі XV ст. у культурных адкладах той жа нішы. Падмурак кухні зложаны з камянёў памерамі 0,2–0,4 м, замацаваных вапнавай рошчынай. Сцены выкладваліся цэглай-пальчаткай, а дахоўкай першай паловы XVI ст. выраўноўвалі паверхню кладкі. Пазней на падмурках сярэдневяковай дваравой кухні былі ўзведзены сцены іншых пабудоў.

Будынак, пакоі № 3 і № 4 якога атапліваліся камінам і печчу, узводзіўся ў канцы XIX ст. Камін быў абкладзены карычневапаліванай кафляй. Заўважна, што вусце печы пакоя № 4 выходзіць у пакой № 3, дзе знаходзіўся камін. Такое размяшчэнне рацыянальнае. Перад паленнем дровы складваліся ў пакоі № 3, не замаруджвалі падлогу пакоя № 4 і не загрувашчвалі яго прастору. Верагодна, у печы і каміна быў агульны комін. Паленне дроў у адным з іх спрые павелічэнню цягі ў коміне і хуткаму распальванню дроў у другім. Сістэма агульнага коміна для печы і каміна выкарыстана наўмысна і мела адпаведную традыцыю. У інвентары 1778 г. вопіс планіроўкі замкавых памяшканняў нярэдка засведчвае печ у адным і камін у сумежным пакоі [4].

На плошчы пакоя № 2 захаваліся рэшткі падлогі сярэдневяковай дваравой кухні. На паўночнай сцяне пакоя не была ўзведзена другая ў пазнейшыя часы.

Будаўнічы матэрыял і тэхніка кладкі цэглы пакоя № 1 паказваюць, што ён быў адным асобным будынкам, узведзеным у канцы XIX, ці пачатку XX ст. на рэштках падмурка аднаго з пакояў сярэдневяковай кухні.

Бетонная лесвіца, якая прымыкала да пакоя № 4, пабудавана ў першай чвэрці XX ст. для праходу да верху ўжо разбураных цагляных сцен, засыпаных грунтам, дзе знаходзілася аранжарэя, арганізаваная пры Святаполк-Мірскім і зафіксаваная на фотаздымку 20-х гадоў XX ст .

Літаратура

1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; С.В. Марцэлеў [і інш.]; гал рэд. С.В. Марцэлеў. – Мн.: Бел. савец. Энцыкл., 1986. – 371 с.
2. Здановіч, Н.І. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н.І. Здановіч, А.К. Краўцэвіч, А.А. Трусаў; пад рэд. М.М. Чарняўскага – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 152 с.
3. Археалагічныя даследаванні абарончага вала, помніка архітэктуры XVI–XX ст. “Мірскі замак” у г. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў 2003 г.: справаздача аб археалагічных раскопках / архіў ІГ НАНБ, справа № 2114 / П.А. Русаў – Мн., 2004. – 30 с.

4. Аляксандр Ярашэвіч. Археаграфічныя звесткі пра Мірскі замак з архіва Радзівілаў // Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, 4 чэрвеня 2005 г, г.п. Мір Гродзен. вобл. / Нав. рэд. Н.Ф. Высоцкая – Мн.: ТАА "Белпрынт", 2006. – 192 с.: іл. С. 54 – 60.